# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень 2024 года*

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*

**9 клас**

**Варыянт 2**

**Заданне 1.**

| Прыказка | Фанетычная транскрыпцыя |
|---|---|
| *З дурнем* ***счэпішся*** *– дурнем* ***зробішся****.* | [шчэп’ішс’а] [зроб’ішс’а] / [шчэп’іс’:а] [зроб’іс’:а] |
| ***Ад хлусні не мруць****, толькі веры болей не даюць.* | [ат_хлус’н’і  н’а_мруц’] |
| *Байка* ***з камара вырасце*** *на вала.* | [с_камара  вырас’ц’э] |
| ***Гульня ў маладосці*** *дае хваробу на старыя косці.* | [гул’н’а  ў_маладос’ц’і] |
| *Ад зладзейства* ***не разжывешся****.* | [н’э_раж:ыв’эшс’а] / [н’э_раж:ыв’эс’:а] |
| ***Раскажаш пра вераб’я****, а перакажуць пра жураўля.* | [раскажаш пра_в’эрабйа] |

**Заданне 2.**

| | Значэнне слова | Магчымыя прыклады |
|---|---|---|
| 1 | Карысны для здароўя | ***Здаровае харчаванне важнае для арганізма.*** |
| 2 | Які мае добрае здароўе; процілеглае *хворы* | ***здаровае дзіця*** |
| 3 | Разважлівы, разумны (перан.) | ***здаровая крытыка; здаровы розум*** |
| 4 | Моцнага целаскладу; дужы (разм.) | ***мажны, здаровы мужчына*** |
| 5 | Непашкоджаны, які правільна дзейнічае (пра органы і часткі цела) | ***здаровы арганізм; здаровае сэрца*** |
| 6 | Вялікі, моцны (пра з’явы, прадметы і пад.) (разм.) | ***Узяў у рукі здаровы кавалак жалеза.*** |

*За кожны правільны прыклад – 1 бал.*

**Заданне 3.**

| | | |
|---|---|---|
| *азірацца* | ‘палохаючыся, старацца ўхіліцца ад адказнасці, ад справы’ | ***азірацца на кусты*** |
| *звязваць* | ‘пазбаўляць магчымасці свабодна дзейнічаць’ | ***звязваць па руках і нагах*** |
| *зраўняць* | ‘поўнасцю разбурыць, знішчыць дашчэнту’ | ***зраўняць з зямлёй*** |
| *набіваць* | ‘старацца ўзвысіць сябе ў вачах іншых, паказаць сябе больш значным’ | ***набіваць сабе цану*** |
| *наводзіць* | ‘няславіць, ачарняць, выстаўляць у непрыглядным святле каго-, што-н.’ | ***наводзіць цень*** |
| *намацваць* | ‘загадзя разведваць што-н., вызначаць шанцы на поспех’ | ***намацваць глебу*** |

*За кожны правільна складзены фразеалагізм – 1 бал.*

**Заданне 4.**

| **Словы, якія не маюць канчатка** | **Словы з нулявым канчаткам** | **Словы з матэрыяльна выражаным канчаткам** | **Словы з двума канчаткамі (у тым ліку нулявымі)** |
|---|---|---|---|
| Пазнаёміўшыся | свой-□ | шт-о-сьці | сем-□-дзесят-□ |
| Тройчы | джэм-□ | в-ас | |
| Журы | | знайшл-а-ся | |
| Крыўдна | | дзевяност-а | |
| | | узмор’[й-э] | |

*За кожную правільна запоўненую ячэйку – 0,5 бала.*

**Заданне 5.**

| **Назоўнік** | **Прыметнік** | **Назоўнік** | **Прыметнік** |
|---|---|---|---|
| *Свіслач* | ***Свіслацкі*** | *Ваўкавыск* | ***ваўкавыскі*** |
| *Добруш* | ***Добрушскі*** | *Гродна* | ***гродзенскі*** |
| *Якут* | ***Якуцкі*** | *Залессе* | ***залескі*** |
| *Свяцк* | ***Свяцкі*** | *узбек* | ***узбекскі*** |
| *Кіргіз* | ***Кіргізскі*** | *Крывы Рог* | ***крыварожскі*** |
| *Славак* | ***Славацкі*** | *Доргунь* | ***доргунскі*** |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 6.**

| Сказ | Тып памылкі (у выпадку яе наяўнасці) | Выпраўлены варыянт (магчымыя варыянты) |
|---|---|---|
| А | **Таўталогія** | ***Праца мастака адзначана высокай узнагародай.*** |
| Б | **Плеаназм** | ***Пераможцы спаборніцтваў атрымалі дыпломы, медалі і сувеніры.*** |
| В | **Таўталогія** | ***Кошт адной паездкі ў гарадскіх аўтобусах і тралейбусах павысіцца з 70 да 80 капеек.*** |
| Г | **Плеаназм** | ***Прыярытэтам дзяржавы з'яўляецца чалавек і яго дабрабыт.*** |
| Д | **Неразмежаванне паронімаў** | ***Намеснік старшыні прывёў некалькі цікавых прыкладаў.*** |
| Е | **Няма памылкі** | ***Пры ўзнікненні праблем з таварам прадавец можа звярнуцца да пакупніка з патрабаваннем прад'явіць гарантыйны талон.*** |

*За кожнае правільнае вызначэнне тыпу памылкі – 0,5 бала, за кожнае правільнае выпраўленне памылкі – 0,5 бала. За правільнае вызначэнне адсутнасці памылкі – 1 бал.*

**Заданне 7.**

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

Пакуль была восень, Сярожа карміў вераб'ёў хлебам, але, калі надышла *(настала)* зіма, ён стаў даваць ім яшчэ зерне. Таму што *(Бо)* хлеб хутка замярзаў, і вераб'і не паспявалі яго здзяўбці. Сярожа вельмі шкадаваў вераб'ёў, асабліва калі пачыналіся моцныя маразы. Небаракі *(бедачыны, бедакі)* сядзелі ўскудлачаныя, нерухомыя, падабраўшы пад сябе змё*(е)*рзлыя лапкі, і цярпліва чакалі пачастунку. Затое як радаваліся яны Сярожу! Варта было яму падысці да акна, як яны зляталіся з усіх бакоў і спяшаліся хутчэй *(быстрэй)* паснедаць.

*За кожную памылку (любога тыпу) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,25 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **А** | **4** | **Б** | **5** | **В** | **6** | **Г** | **7** | **Д** | **3** | **Е** | **1** |

*За кожную правільна вызначаную пару – 1 бал.*

**Заданне 9.**

| Аўтар | Назва твора |
|---|---|
| **Кандрат Крапіва** | **«Ганарысты парсюк»** |
| **Васіль Быкаў** | **«Незагойная рана»** |
| **Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч** | **«Пінская шляхта»** |
| **Вячаслаў Адамчык** | **«Салодкія яблыкі»** |

*За кожнае правільнае вызначэнне назвы твора – 1 бал, за правільнае вызначэнне аўтара – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

*Ацэнка за заданне складаецца з двух кампанентаў: пераліку твораў і характарыстыкі аднаго з іх.*

*Пералік твораў*

| Колькасць балаў | Рэкамендацыі па ацэнцы |
|---|---|
| 1 | *Названы тры творы, у якіх адлюстравана жыццё беларусаў да ХХ стагоддзя, і іх аўтары* |
| 0,5 | *Названы два творы, у якіх адлюстравана жыццё беларусаў да ХХ стагоддзя, і іх аўтары*<br>*АБО*<br>*Названы тры творы, у якіх адлюстравана жыццё беларусаў да ХХ стагоддзя, і іх аўтары. Маюцца памылкі пры вызначэнні аўтарства Маюцца памылкі пры вызначэнні аўтарства або недакладнасці ў назвах твораў (напрыклад: “Палеская шляхта”)* |
| 0 | *Названы толькі адзін твор, у якім адлюстравана жыццё беларусаў да ХХ стагоддзя, і яго аўтар*<br>*АБО*<br>*Названы творы, у якіх не адлюстравана жыццё беларусаў да ХХ стагоддзя*<br>*АБО*<br>*Адказ адсутнічае* |

*Характарыстыка твора: за правільнае вызначэнне тэматыкі – 1 бал, праблематыкі – 1 бал, жанру – 1 бал, за называнне герояў – 1 бал, вызначэнне матывацыі для чытання твора замежным чытачом – 1 бал.*